МІНІСТЭРСТВА СЕЛЬСКАЙ ГАСПАДАРКІ
І ХАРЧАВАННЯ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

ГАЛОЎНАЕ ЎПРАЎЛЕННЕ АДУКАЦЫІ,
НАВУКІ І КАДРАВАЙ ПАЛІТЫКІ

Установа адукацыі
«БЕЛАРУСКАЯ ДЗЯРЖАЎНАЯ
ОРДЭНАЎ КАСТРЫЧНІЦКАЙ РЭВАЛЮЦЫІ
І ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА
СЕЛЬСКАГАСПАДАРЧАЯ АКАДЭМІЯ»

Л. У. Селібірава

# БЕЛАРУСКАЯ МОВА

## ПРАФЕСІЙНАЯ ЛЕКСІКА

*Дапаможнік*
*для студэнтаў усіх спецыяльнасцей УА БДСГА*

Горкі
БДСГА
2024

УДК 811.161.3(075.8)
ББК 81.я73(4Беи)
С29

*Рэкамендавана метадычнай камісіяй*
*па сацыяльна-гуманітарных і лінгвістычных дысцыплінах*
*20.03.2024 (пратакол № 7)*
*і Навукова-метадычным саветам БДСГА*
*27.03.2024 (пратакол № 7)*

Аўтар:
кандыдат філалагічных навук, дацэнт *Л. У. Селібірава*

Рэцэнзенты:
кандыдат філалагічных навук, дацэнт *Г. К. Чахоўскі*;
кандыдат філалагічных навук, дацэнт *Л. А. Гадуйка*

**Селібірава, Л. У.**
С29 Беларуская мова. Прафесійная лексіка : дапаможнік / Л. У. Селібірава. – Горкі : БДСГА, 2024. – 58 с.
ISBN 978-985-882-496-9.

У дапаможніку змешчаны тэксты з заданнямі па арфаграфіі, марфалогіі, сінтаксісе, стылістыцы, культуры маўлення, а таксама тэксты для перакладу з рускай мовы на беларускую. Дапаможнік прызначаны для працы на занятках і для самастойнай работы.

Для студэнтаў усіх спецыяльнасцей УА БДСГА.

**УДК 811.161.3(075.8)**
**ББК 81.я73(4Беи)**

**ISBN 978-985-882-496-9**

© УА «Беларуская дзяржаўная сельскагаспадарчая акадэмія», 2024

# ПРАДМОВА

У негуманітарных установах вышэйшай адукацыі сярод прадметаў сацыяльна-гуманітарнага цыкла важнае месца займае дысцыпліна «Беларуская мова. Прафесійная лексіка». Заняткі па беларускай мове адыгрываюць вялікую ролю ў падрыхтоўцы будучага спецыяліста як камунікатыўна развітай асобы, здольнай належным чынам карыстацца моўнымі сродкамі для правільнага афармлення сваіх думак.

Даны дапаможнік створаны з мэтай аднаўлення і сістэматызацыі ведаў і ўменняў па пэўных раздзелах і тэмах, выхавання любові да роднай мовы і прызначаны для практычных заняткаў па дысцыпліне «Беларуская мова. Прафесійная лексіка» са студэнтамі, якія навучаюцца ва ўстанове адукацыі «Беларуская дзяржаўная сельскагаспадарчая акадэмія» па ўсіх спецыяльнасцях.

Дапаможнік пабудаваны на аснове тэкстаў мастацкага, публіцыстычнага і навуковага стыляў. Тэксты вызначаюцца тэматычнай разнастайнасцю, маюць вялікае пазнавальнае і выхаваўчае значэнне.

Прапанаваныя паслятэкставыя заданні ахопліваюць усе найбольш важныя правілы арфаграфіі, марфалогіі, сінтаксісу, стылістыкі, культуры маўлення. З мэтай прадухілення ў вусным і пісьмовым маўленні памылак руска-беларускай моўнай інтэрферэнцыі змешчаны тэксты для перакладу з рускай мовы на беларускую.

Дапаможнік прызначаны як для працы студэнтаў пад кіраўніцтвам выкладчыка, так і для самастойнай работы.

# ТЭКСТЫ З ЗАДАННЯМІ

## Цёплыя ўспаміны

1) Сівыя хмары неспакойна забегалі па нізкім студзеньскім небе. 2) Працяжна зашумелі дрэвы. 3) Пасыпаўся снег мільярдамі крупінак, бялюткіх, іскрыстых. 4) Залёталі, закружыліся яны халодным пылам. 5) Разгулялася гулкая мецеліца.

6) А ў Галіны Пятроўны ў пакоі пахне восенню: на стале ў тонкай крыштальнай вазачцы – лісце. 7) Засохлае восеньскае лісце. 8) Вось лімонны, з тонкімі зялёнымі прожылкамі лісток бярозы. 9) Зірнула на яго Галіна Пятроўна – і адразу ж у думках перанеслася на янтарную восеньскую паляну.

10) Прысела Галіна Пятроўна каля маладзенькай бярозкі. 11) Ногі па калені тонуць у пышных грывах верасу. 12) На паляне, быццам на пчальніку, соладка пахне мёдам. 13) Побач з беластволай бярозкай яшчэ адно дрэва – раскідзістая высокая хвоя. 14) Хруснуў сучок, мякка ўпала хваёвая шышка. 15) Раптам бачыць: паволі апускаецца на зямлю адзінокі жоўты лісток. 16) Бярозавы. 17) Пэўна, не звярнула б яна ўвагі на той адзінокі лісток, бо іх, самотных, у гэты час шмат адрываецца ад галінак, але на фоне цёмна-зялёнай елкі нельга было не заўважыць залаціста-барвовага пасланца восені, як немагчыма не заўважыць у начным небе зоркі-знічкі. 18) Вальсуючы, паволі падаў долу ліст. 19) Не даляцеўшы да зямлі, ён раптам спыніўся і затрымцеў. 20) Галіна Пятроўна вырашыла паглядзець, што спыніла лісток. 21) Аказалася, ён, бедалага, зачапіўся за павуцінне, наснаванае паміж галінкамі павуком-крыжавіком. 22) Галіна Пятроўна асцярожна вызваліла лісток і паклала ў абшытый зверху скуранай палоскай кошык, куплены некалі на хутары ў бабулі. 23) Меў гэты незвычайны кошык шэсць уставак з каляровага дроту.

24) Цяпер бярозавы лісток разам з некалькімі кляновымі стаіць у Галіны Пятроўны на стале як напамін пра залатаструнную восень, якая ўступіла месца беласнежнай зіме. 25) Толькі ж і зіма-летуценніца не назаўсёды…

### *Заданні да тэксту*

**Заданне 1.** У адным са сказаў 18–22 тэксту знайдзіце слова, якое ўжыта ў значэнні ‘*пачаў трэсціся, калыхацца*’.

**Заданне 2.** У 4-м сказе тэксту знайдзіце антонім да прыметніка *цёплы*.

**Заданне 3.** У 21-м сказе тэксту знайдзіце назоўнік агульнага роду, пастаўце яго ў форму назоўнага склону множнага ліку.

**Заданне 4.** Пастаўце падкрэслены ў 24-м сказе тэксту назоўнік у форму роднага склону адзіночнага ліку.

**Заданне 5.** Знайдзіце ў 24-м сказе тэксту займеннік, які з'яўляецца дзейнікам.

**Заданне 6.** Утварыце ад падкрэсленага ў 23-м сказе тэксту колькаснага лічэбніка парадкавы. Пастаўце парадкавы лічэбнік у форму давальнага склону адзіночнага ліку мужчынскага роду.

**Заданне 7.** Адзначце слова, ад якога ўтворана падкрэсленае ў 2-м сказе тэксту прыслоўе:

а) працяжны; б) працягваць; в) працягнуць; г) працяг; д) працягласць.

**Заданне 8.** У 21-м сказе тэксту знайдзіце дзеепрыметнік, пастаўце яго ў форму назоўнага склону адзіночнага ліку мужчынскага роду.

**Заданне 9.** Адзначце характарыстыкі, якія адпавядаюць слову, падкрэсленаму ў 18-м сказе тэксту:

а) дзеепрыметнік; б) у сказе выконвае ролю выказніка; в) не скланяецца і не спрагаецца; г) утворана пры дапамозе суфікса -*чы*; д) мае незакончанае трыванне.

**Заданне 10.** У 22-м сказе тэксту знайдзіце слова з марфалагічнай памылкай. Выпраўце памылку.

**Заданне 11.** У 5-м сказе тэксту знайдзіце слова з арфаграфічнай памылкай. Выпраўце памылку.

**Заданне 12.** Вызначце стыль і тып тэксту.

## Глыбоцкія азёры

1) Глыбоччына, <u>мой</u> чароўны, утульны куточак! 2) Ты з радасцю сустракаеш усіх, хто жадае сэрцам дакрануцца да казачнай прыгажосці краявідаў. 3) Цяжка сказаць, якое са ста шасці азёр Глыбоччыны, вялікіх і малых, самае прыгожае, прыцягальнае. 4) Усе азёры выклікаюць захапленне ў кожнага вандроўніка, якому пашчасціла хоць раз ступіць на іх квяціста-духмяныя берагі.

5) Найбуйнейшае возера, што вабіць не толькі глыбачан, але і шматлікіх турыстаў, замежных гасцей, носіць незвычайную назву – Шо. 6) На паўднёвым беразе возера ёсць мясціна, якую тутэйшыя

рыбакі празвалі Крыжамі. 7) Калі прыгледзецца, то можна ўбачыць на невялікай глыбіні валуны розных крыжападобных канфігурацый. 8) Старажылы расказваюць, быццам калісці тут былі могілкі, але дно возера апусцілася, пахаваўшы іх пад вадзяной роўняддзю.

9) Асаблівасць возера Гінькава заключаецца ў тым, што ў абрыве крутога схілу маецца збудаванне – хутчэй за ўсё склеп з паўкруглымі каменнымі нішамі. 10) Аб ім ходзіць цікавая легенда, паводле якой у пячоры нібыта некалі захоўваліся нарабаваныя скарбы напалеонаўскага войска.

11) Шмат легенд і не адно паданне складзена і пра трэцяе возера – Івесь, узгорак на беразе якога завуць Царкавішчам. 12) Так, напрыклад, існуе легенда, у якой расказваецца пра храм, што праваліўся пад зямлю. 13) І сёння, кажуць, на велікодныя святы, прыклаўшы вуха да зямлі, на Царкавішчы можна пачуць гукі званоў і царкоўныя спевы. 14) Кожны год перад замаразкамі сюды злятаюцца лебедзі (больш за пяцьсот светлых птахаў), а на пытанне аб тым, што іх прыцягвае, што дае вольнай птушцы гэта мясціна, у арнітолагаў пакуль няма адказу.

### *Заданні да тэксту*

**Заданне 1.** У адным са сказаў 3–8 тэксту знайдзіце слова, якое мае значэнне ‘*захапляць, зачароўваць сваім выглядам, прыцягваць да сябе*’.

**Заданне 2.** У 4-м сказе тэксту знайдзіце сінонім да назоўніка *падарожнік*.

**Заданне 3.** У 11-м сказе тэксту знайдзіце антонім да прыслоўя *мала*.

**Заданне 4.** Пастаўце падкрэслены ў 9-м сказе тэксту назоўнік у форму роднага склону адзіночнага ліку.

**Заданне 5.** Пастаўце падкрэсленае ў 11-м сказе тэксту словазлучэнне ў форму творнага склону адзіночнага ліку.

**Заданне 6.** Пастаўце падкрэслены ў 13-м сказе тэксту прыметнік у форму назоўнага склону адзіночнага ліку мужчынскага роду.

**Заданне 7.** Знайдзіце ў 11-м сказе тэксту парадкавы лічэбнік і пастаўце яго ў форму давальнага склону множнага ліку.

**Заданне 8.** Пастаўце падкрэслены ў 1-м сказе тэксту займеннік у форму назоўнага склону множнага ліку.

**Заданне 9.** Ад асновы дзеяслова, падкрэсленага ў 8-м сказе тэксту, утварыце дзеепрыслоўе.

**Заданне 10.** У 10-м сказе тэксту знайдзіце слова з марфалагічнай памылкай. Выпраўце памылку.

**Заданне 11.** У 8-м сказе тэксту знайдзіце слова з арфаграфічнай памылкай. Выпраўце памылку.

**Заданне 12.** Вызначце стыль і тып тэксту.

## Балотныя пацеркі

1) «Дрэвы ў пазалоце, вокліч жураўліны; восень на балоце сее журавіны…» 2) Чытаю гэтыя радкі Язэпа Пушчы і думаю пра тое, якое дзіўнае слова – журавіны! 3) Колькі ў ім музыкі!

4) Кожны ведае, што дарога да журавінавых мясцін дальняя: вядзець яна на імшарыны, куды не заедзеш і дзе пешкі не заўсёды пройдзеш, бо пад нагамі зямля аж дрыжыць. 5) Але як радуешся, калі, прабраўшыся, убачыш пад разгалістымі хвоямі купіны, якія нагадваюць мякенькія падушачкі і на кожнай з якіх ягад-пацерак нібы насыпана.

6) Журавіны восенню з кіслінкай, а таму свежых многа не з'ясі. 7) Затое лекі з іх – няма другіх такіх ва ўсім свеце! 8) Пра гэта беларусы ведаюць здаўна, як і пра тое, што многія стравы проста казачнымі робяцца, калі пакласці ў іх крыху балотных пацерак. 9) А якія смачныя журавіны, што засталіся на імшарыне і перазімавалі! 10) Такія ягады за ўсе цукеркі саладзейшыя. 11) Аднак не вельмі налягайце, пакіньце ласунак гаспадарам балотнай краіны.

12) Чуеце, як з паднебесся радасна звіняць іх срэбныя трубы: «Курлы-ы! Курлы-ы!» 13) Праўду людзі кажуць: вясной зверху пячэ, а знізу кусае. 14) Часам уначы, нягледзячы на руплівае дзённае сонца, неспадзявана вернецца зіма, каб сыпнуць снегу, як з напоўненага меха, каб марозу напусціць на ўсё жывое. 15) Ды гэта паўбяды. 16) Страшней за ўсё бяскорміца, асабліва для жураўлёў. 17) Бо яны нядаўна вярнуліся з выраю і не на жарт стаміліся. 18) Адзін ратунак у жураўлёў – ягады балотныя. 19) Таму, мабыць, і называюць дзе-нідзе ў нашай краіне журавіны крышачку інакш, але вельмі паэтычна – жураўлінамі.

### *Заданні да тэксту*

**Заданне 1.** У 4-м сказе тэксту знайдзіце сінонім да назоўніка *шлях*.

**Заданне 2.** У 5-м сказе тэксту знайдзіце антонім да прыметніка *цвёрды*.

**Заданне 3.** Пастаўце падкрэслены ў 4-м сказе тэксту назоўнік у форму давальнага склону адзіночнага ліку.

**Заданне 4.** Пастаўце падкрэслены ў 14-м сказе тэксту назоўнік у форму меснага склону адзіночнага ліку.

**Заданне 5.** Ад назоўніка, падкрэсленага ў 1-м сказе тэксту, утварыце прыметнік пры дапамозе суфікса *-ск-*. Пастаўце гэты прыметнік у форму назоўнага склону адзіночнага ліку мужчынскага роду.

**Заданне 6.** Пастаўце падкрэслены ў 2-м сказе тэксту займеннік у форму назоўнага склону множнага ліку.

**Заданне 7.** Пастаўце падкрэслены ў 5-м сказе тэксту дзеяслоў у неазначальную форму.

**Заданне 8.** Ад асновы дзеяслова, падкрэсленага ў 8-м сказе тэксту, утварыце поўны дзеепрыметнік і пастаўце яго ў форму назоўнага склону адзіночнага ліку мужчынскага роду.

**Заданне 9.** У 4-м сказе тэксту знайдзіце слова з марфалагічнай памылкай. Выпраўце памылку.

**Заданне 10.** У 12-м сказе тэксту знайдзіце слова з арфаграфічнай памылкай. Выпраўце памылку.

**Заданне 11.** З двух прыметнікаў *карыслівы* і *карысны* выберыце той, які лексічна спалучаецца з падкрэсленым у 10-м сказе тэксту назоўнікам.

**Заданне 12.** Вызначце стыль і тып тэксту.

## Словаўтварэнне ў беларускай мове

1) Вызначэнне словаўтваральнай структуры – гэта свайго роду этымалагічны аналіз. 2) Вызначэнне словаўтваральнай будовы прадугледжвае наступныя этапы: вылучаецца група вытворных слоў, выдзяляецца іх корань. 3) Знайсці корань можна, … гісторыю слова. 4) Выдзяліўшы першасны корань, можна ўбачыць, што само слова азначала раней, калі, чаму і якія адбыліся ў ім змены.

5) Возьмем словы, якія ў беларускай мове абазначаюць зімовае надвор’е: *замець, мяцеліца, завея, завіруха*. 6) *Мяцеліца* – старажытнае слова. 7) Яго ўзнікненне трэба звязаць з дзеясловам «*месці*». 8) Блізкім па значэнні да назвы *«мяцеліца»* з’яўляецца назоўнік *«завея»*. 9) Дадзены назоўнік аддзеяслоўны, утвораны на базе прэфіксальнага *«завеяць»*. 10) Назва *«мяцеліца»* падкрэсліваець, што снег уздымаецца, мяцецца. 11) *«Завея»* звязваецца з веяннем, насыпаннем снежных

гурбаў. 12) Назоўнік *«завіруха»* мае сувязь са словамі *«вір»*, *«віравацъ»*, *«вірыць»*. 13) Акрамя таго, назоўнік *«завіруха»* ў беларускай мове з даўніх часоў ужываецца ў пераносным значэнні – *«неспакой, бязладзіца»*. 14) Падставай для таго, каб у беларускай мове назваць зімовыя месяцы *«снежнем»*, *«студзенем»*, *«лютым»*, паслужылі прыродныя з'явы: снег, сцюжа, лютЫ (моцны) мароз.

### *Заданні да тэксту*

**Заданне 1.** У адным са сказаў 10–14 тэксту знайдзіце слова, якое мае значэнне '*прычына, абставіны, якія з'яўляюцца асновай для чаго-небудзь*'.

**Заданне 2.** Адзначце словы, якія могуць быць ужыты на месцы пропуску ў 3-м сказе тэксту:

а) адчуўшы; б) высветліўшы; в) здолеўшы; г) ажыццявіўшы; д) вызначыўшы.

**Заданне 3.** У 8-м сказе тэксту знайдзіце сінонім да назоўніка *найменне*.

**Заданне 4.** У 6-м сказе тэксту знайдзіце антонім да прыметніка *новы*.

**Заданне 5.** Пастаўце падкрэслены ў 4-м сказе тэксту назоўнік у форму назоўнага склону множнага ліку.

**Заданне 6.** Пастаўце падкрэслены ў 10-м сказе тэксту назоўнік у форму роднага склону адзіночнага ліку.

**Заданне 7.** Пастаўце падкрэслены ў 14-м сказе тэксту прыметнік у форму назоўнага склону множнага ліку.

**Заданне 8.** Пастаўце падкрэслены ў 4-м сказе тэксту займеннік у форму давальнага склону адзіночнага ліку.

**Заданне 9.** Ад асновы дзеяслова, падкрэсленага ў 7-м сказе тэксту, утварыце поўны дзеепрыметнік і пастаўце яго ў форму назоўнага склону адзіночнага ліку мужчынскага роду.

**Заданне 10.** У 10-м сказе тэксту знайдзіце слова з марфалагічнай памылкай. Выпраўце памылку.

**Заданне 11.** У 4-м сказе тэксту знайдзіце слова з арфаграфічнай памылкай. Выпраўце памылку.

**Заданне 12.** Вызначце стыль і тып тэксту.

## Залацінкі народнай мудрасці

1) У мове нашага народа шмат кароткіх, але (трапных, трапятлівых) выразаў, якія пры ўмелым выкарыстанні зіхацяць, як золата, надаюць роднай мове вобразнасць, маляўнічасць, чароўнасць. 2) Размова вядзецца, зразумела, пра фразеалагізмы, прыказкі і прымаўкі: *адвесці душу*; *вялікаму каню – вялікі хамут*. 3) А яшчэ – пра добразычлівыя ды жартоўныя пажаданні (*каб было і ў місцы, і ў калысцы*; *каб дзяды не ведалі бяды, а ўнукі – мукі*) і пра параўнанні (*сівы, як голуб*). 4) Адным словам, пра невычэрпныя і неўміручыя залацінкі народнай мудрасці. 5) Залацінкі, што, быццам узор на кашулі-вышыванцы, ажыўляюць, расквечваюць мову. 6) Мова, аздобленая такімі залацінкамі, закранае і розум, і сэрца.

7) Безумоўна, заўсёды хочацца пачуць гісторыю пра тое, як узніклі цікавыя і дакладныя выразы. 8) Вось, напрыклад, фразеалагізм «*вады не замуціць*», які нярэдка ўжываецца ў маўленні і з якім мы (не, ні) раз сустракаліся. 9) Дакладна сказаць, калі і ў сувязі з чым жа ўзнік дадзены ўстойлівы выраз, цяжка. 10) Вядома, што ён бытуе ў многіх народаў. 11) І ёсць наконт гэтага пэўнае меркаванне. 12) Не ў адной мясцовасці ў старажытныя часы жанчыны мылі бялізну на берагах рэк. 13) Імкнучыся не нашкодзіць людзям, якія жылі ніжэй па цячэнні, яны стараліся не муціць рачной вады.

14) У нашы дні характарызаваць чалавека як таго, хто «*вады не замуціць*», азначае надзяляць яго сціпласцю, тактоўнасцю, (указываць, указваць) на яго ўважлівасць да іншых. 15) На тое, што ён нікаму і ніколі не зробіць ніякай шкоды.

### *Заданні да тэксту*

**Заданне 1.** З двух слоў, падкрэсленых у 5-м сказе тэксту, вызначце тое, якое з’яўляецца сродкам сувязі 4-га і 5-га сказаў.

**Заданне 2.** З двух слоў, прапанаваных у дужках у 1-м сказе тэксту, вызначце тое, якое павінна быць ужыта ў дадзеным сказе.

**Заданне 3.** У 9-м сказе тэксту знайдзіце сінонім да прыслоўя *канкрэтна*.

**Заданне 4.** У 7-м сказе тэксту знайдзіце слова, у якім ёсць зычны гук [з’].

**Заданне 5.** Пастаўце падкрэслены ў 12-м сказе тэксту назоўнік у форму меснага склону адзіночнага ліку.

**Заданне 6.** Пастаўце падкрэслены ў 2-м сказе тэксту прыметнік у простую форму вышэйшай ступені параўнання (назоўны склон, адзіночны лік, мужчынскі род).

**Заданне 7.** Ад асновы дзеяслова, падкрэсленага ў 7-м сказе тэксту, утварыце поўны дзеепрыметнік залежнага стану і пастаўце яго ў форму назоўнага склону адзіночнага ліку мужчынскага роду.

**Заданне 8.** Знайдзіце ў 9-м сказе тэксту часціцу.

**Заданне 9.** З дзвюх часціц, прапанаваных у дужках у 8-м сказе тэксту, вызначце тую, якая павінна быць ужыта ў дадзеным сказе.

**Заданне 10.** Знайдзіце ў 15-м сказе тэксту слова, якое не адпавядае нормам беларускай літаратурнай мовы. Выпраўце памылку.

**Заданне 11.** З двух дзеясловаў, прапанаваных у дужках у 14-м сказе тэксту, вызначце той, які адпавядае нормам беларускай літаратурнай мовы.

**Заданне 12.** Вызначце стыль і тып тэксту.

## Грыбнікі

1) «Дзянёк сёння будзе як на заказ. Айда, Васілёк, у лес! Можа, грыбоў напалюем?» – сказаў Антон, разбудзіўшы ўнука на досвітку ў нядзельку.

2) У лесе ўжо рашуча распараджалася восень. 3) Восень смела гаспадарыла ўсюды, але ў лесе яе работа здавалася найбольш значнай і чароўнай. 4) Па загадзе восені-чараўніцы вясёлы, гарэзлівы ветрык раскалашмаціў косы бярозкам. 5) А сама гаспадыня дакранулася да залатой фарбы і дзе акрапіла бярозавыя лісточкі, а дзе правяла па іх (праўда, не поўнасцю, а толькі па самаму краю) тонкім залатым шнурочкам. 6) Не пашкадавала і рассыпала сонечныя залацінкі па лісці таполяў, ясеняў, дадаўшы крышку чырвані. 7) Лёгкім, нячутным крокам прайшлася каля явара. 8) Прыхінула да сябе яго галінкі, … пагладзіла ды адпусціла. 9) І стаў явар барвовы, нібы нечага засаромеўся. 10) Клёны, вакол якіх кружылася, вілася восень не адзін дзень, былі непадобныя адзін да аднаго: некаторыя мелі лімонна-жоўты колер, іншыя – чырванаваты.

11) – Скажы, восенню лес слаўны? – звярнуўся да унука дзядуля.

12) – Ага! – азваўся Васілёк і раптам ускрыкнуў: – Эх, дрэнны з цябе грыбнік, дзядуля! Баравікоў побач з сабою не бачыш!

13) – Цэлая сямейка! Кладзі хутчэй у кошык! – узрадаваўся Антон і дадаў: – Цяпер мая чарга хоць адзін баравік адшукаць.

## *Заданні да тэксту*

**Заданне 1.** У адным са сказаў 9–13 тэксту знайдзіце слова, якое мае значэнне ‘*харошы, які дае радасць*’.

**Заданне 2.** Адзначце словы, якія могуць быць ужыты на месцы пропуску ў 8-м сказе тэксту:

а) сардэчна; б) станоўча; в) пяшчотна; г) лагодна; д) плённа.

**Заданне 3.** У 2-м сказе тэксту знайдзіце антонім да прыслоўя *нясмела*.

**Заданне 4.** Падбярыце сінонімы да падкрэсленага ў 1-м сказе тэксту фразеалагізма.

**Заданне 5.** Пастаўце падкрэслены ў 4-м сказе тэксту назоўнік у форму роднага склону адзіночнага ліку.

**Заданне 6.** Пастаўце падкрэслены ў 6-м сказе тэксту назоўнік у форму меснага склону множнага ліку.

**Заданне 7.** Пастаўце падкрэслены ў 5-м сказе тэксту займеннік у форму давальнага склону адзіночнага ліку.

**Заданне 8.** Ад асновы дзеяслова, падкрэсленага ў 13-м сказе тэксту, утварыце поўны дзеепрыметнік і пастаўце яго ў форму назоўнага склону адзіночнага ліку мужчынскага роду.

**Заданне 9.** Вызначце, ад якога слова і якім спосабам утворана падкрэсленае ў 3-м сказе прыслоўе.

**Заданне 10.** У 5-м сказе тэксту знайдзіце словазлучэнне з марфалагічнай памылкай. Выпраўце памылку.

**Заданне 11.** У 11-м сказе тэксту знайдзіце слова з арфаграфічнай памылкай. Выпраўце памылку.

**Заданне 12.** Вызначце стыль і тып тэксту.

## Родныя мясціны

1) Я з хваляваннем выбіраўся ў Акопы. 2) Быў сонечны празрысты вераснёўскі дзень. 3) Імклівая шаша. 4) Нарэшце – вёска Карпілаўка. 5) Зашчымела на сэрцы ад знаёмай дарагой назвы. 6) Тут у пачатку мінулага стагоддзя была сядзіба пісьменніка Ядвігіна Ш. 7) Менавіта ў яе сценах Янка Купала ўпершыню прачытаў слухачам сваю «Паўлінку». 8) А трошкі пазней, падчас першай імперыялістычнай вайны, у гэтай самай сядзібе размяшчаўся прытулак для дзяцей-бежанцаў, якімі апекавалася нястомная руплівіца на ніве нашага пісьменства Зоська Верас.

9) Паваротак направа, дарога на Харужанцы. 10) Праз якія два-тры кіламетры, не даязджаючы да вёскі, зварочваю ў казачны восеньскі лес. 11) І ўсе гарадскія клопаты адразу засталіся дзесьці далёка-далёка, быццам іх і не было. 12) Змешаны лес маніў у свае грыбныя нетры, шчодра рассыпаўшы навокал залатыя чырвонцы лістоты. 13) Аднак неўзабаве праваруч аткрылася поле з вузкімі грывамі пералескаў. 14) Вось і адмыслова зробленая брама. 15) Пад яе стрэшкай акуратна выразанае на пацямнелай ад часу і дажджоў дошцы слова – Акопы. 16) Першае, што ўражвае тут, – нейкая асаблівая, урачыстая цішыня. 17) Яна быццам запрашае прыслухацца да самаго сябе.

## *Заданні да тэксту*

**Заданне 1.** У 12-м сказе тэксту вызначце словы, якія ўжываюцца ў пераносным значэнні.

**Заданне 2.** Адзначце сінонім да падкрэсленага ў 16-м сказе тэксту прыметніка:

а) паўсядзённы; б) святочны; в) звычайны; г) будні; д) прыгожы.

**Заданне 3.** Пастаўце падкрэслены ў 2-м сказе тэксту назоўнік у форму роднага склону адзіночнага ліку.

**Заданне 4.** Пастаўце падкрэслены ў 13-м сказе тэксту назоўнік у форму творнага склону множнага ліку.

**Заданне 5.** Пастаўце падкрэслены ў 5-м сказе тэксту прыметнік у форму назоўнага склону множнага ліку.

**Заданне 6.** Пастаўце падкрэслены ў 8-м сказе тэксту дзеяслоў у неазначальную форму.

**Заданне 7.** Адзначце характарыстыкі, якія адпавядаюць падкрэсленаму ў 10-м сказе тэксту дзеяслову:

а) зваротны; б) незакончанага трывання; в) адзіночнага ліку, цяперашняга часу; г) умоўнага ладу; д) 1-га спражэння.

**Заданне 8.** Утварыце ад падкрэсленага ў 1-м сказе тэксту дзеяслова дзеепрыслоўе.

**Заданне 9.** Вызначце, ад якога слова і якім спосабам утвораны падкрэслены ў 17-м сказе тэксту дзеяслоў.

**Заданне 10.** У 17-м сказе тэксту знайдзіце слова з марфалагічнай памылкай. Выпраўце памылку.

**Заданне 11.** У 13-м сказе тэксту знайдзіце слова з арфаграфічнай памылкай. Выпраўце памылку.

**Заданне 12.** Вызначце стыль і тып тэксту.

## Алей

1) Вучоныя лічаць, што слова алей, добра вядомае заходнеславянскім і ўсходнеславянскім мовам, – даўняе запазычанне з лацінскай мовы – oleum. 2) Са старажытных часоў склалася традыцыя называць ім на беларускіх землях любое масла, выробленае з расліннага насення (па-руску – растительное масло). 3) Калі патрабавалася ўдакладніць гатунак алею, то ўжывалі адпаведны прыметнік: выраблены з льну – ільняны алей, з каноплі – канапляны. 4) Самы папулярный у нашых умовах сланечнікавы алей (па-руску – подсолнечное масло): *дранікі з раніцы ў печы прэюць, хоць на алеі, але смачныя*.

5) Пра папулярнасць алею ў нас сведчаць шматлікія словы, утвораныя ад яго, – алейнік, алейніца, алейня, алейны.

6) Нельга выкарыстоўваць назоўнік алей у якасці назвы любога масла. 7) Харчовы тлушч, атрыманы збіваннем вяршкоў, па-беларуску мае назву масла. 8) А вось для наймення тэхнічнага масла ўжываецца ў беларускай мове яшчэ адно лацінскае слова – аліва: руск. машинное масло – аліва, машынная аліва; руск. трансформаторное масло – трансфарматарная аліва. 9) Класікі беларускай літаратуры заўсёды выкарыстоўвалі менавіта гэты назоўнік: *трактар каштуе вялікіх грошай*: *і сам ён дарагі, і бензін трэба, аліву*.

10) Такім чынам, будзьце ўважлівымі пры выбары патрэбнага слова. 11) Рэчыва, якое намазываюць на хлеб, робячы бутэрброд, – гэта масла; рэчыва, на якім смажаць, напрыклад, кабачкі, бульбу, якім запраўляюць салату, – алей, а рэчыва, якім змазваюць дэталі або якое заліваюць у машыну, – аліва.

### *Заданні да тэксту*

**Заданне 1.** Знайдзіце ў тэксце слова, якое адпавядае значэнню ‘*тлусты верхні слой на малацэ, якое адстаялася*’.

**Заданне 2.** У 8-м сказе тэксту знайдзіце сінонім да дзеяслова *выкарыстоўвацца*.

**Заданне 3.** Вызначце часціну мовы падкрэсленага ў 1-м сказе тэксту слова.

**Заданне 4.** Пастаўце падкрэслены ў 7-м сказе тэксту назоўнік у форму роднага склону адзіночнага ліку.

**Заданне 5.** Пастаўце падкрэслены ў 11-м сказе тэксту назоўнік у форму меснага склону адзіночнага ліку.

**Заданне 6.** Пастаўце падкрэслены ў 8-м сказе тэксту прыметнік у форму назоўнага склону множнага ліку.

**Заданне 7.** Вызначце, ад якога слова і якім спосабам утвораны падкрэслены ў 10-м сказе тэксту прыметнік.

**Заданне 8.** У 7-м сказе тэксту знайдзіце дзеепрыметнік.

**Заданне 9.** Адзін з дзеясловаў тэксту напісаны з памылкай. Знайдзіце яго і выпраўце памылку.

**Заданне 10.** У 4-м сказе тэксту знайдзіце слова з марфалагічнай памылкай. Выпраўце памылку.

**Заданне 11.** У 3-м сказе тэксту знайдзіце слова з арфаграфічнай памылкай. Выпраўце памылку.

**Заданне 12.** Вызначце стыль і тып тэксту.

## Юльчына радасць

1) Ганна аж спалохалася, калі дзверы неяк вельмі хуценька адчыніліся і ў хату ўбегла дачушка Юлька. 2) У мокрым ад ранішняй расы прыполе квяцістай сукенкі яна, гордая, шчаслівая, трымала бусляня.

3) – Дзе ты яго знайшла? – здзівілася маці.

4) – Бегла паблізу яблычнага саду дзеда Андрэя і ўбачыла! – весела адказала Юлька.

5) Дачушка і маці апусціліся на падлогу і з яўнай цікавасцю пачалі разглядаць бусляня, якое хоць і было добра аперannae, але не магло яшчэ стаяць на цыбатых нагах, падала то на адзін, то на другі бок. 6) «Не бойся, родненькае, усё будзе добра!» – пачала суцяшаць крыху напалоханае бусляня Юлька. 7) Яна гладзіла мокрыя пёры птушкі, чырвоныя, нібы азяблыя, ногі і радавалася: такога ў яе жыцці яшчэ не было. 8) Праўда, гады два таму назад дзядзька Мікалай даў патрымаць на руках дзікае качаня, а нядаўна, у пачатку чэрвеня, дзяўчынцы ўдалося злавіць на гарышчы галубку. 9) Але ж гэта не бусел.

10) Юлька прытуліла цёплую птушыную галаву да шчакі і заплюшчыла ад задавальнення вочы. 11) Апоўдні ў хату зайшоў дзед Андрэй і, прысеўшы на лаву, стаў расказваць пра тое, што буслы могуць скідваць з гнязда птушанят, калі прадчуваюць душную парнасць. 12) Дзед параіў самім выхадзіць бусляня, і Юлька з радасцю адгарадзіла для птушкі куточак каля печы.

13) На наступны дзень пра шчасце дзяўчынкі ведалі ўсе вясковыя дзеці, і з самага ранку яны, цікаўныя, сабраліся ў Юльчынай хаце. 14) А бусляня, якое абсохла і пахарашэла, то ўдзячна пазірала на малых, то смакавала прапанаваную яму ў міске рыбу.

## *Заданні да тэксту*

**Заданне 1.** У 6-м сказе тэксту знайдзіце сінонім да дзеяслова *супакойваць*.

**Заданне 2.** У адным са сказаў 2–5 тэксту знайдзіце лексічную памылку (няправільна ўжытае па значэнні слова). З прапанаваных слоў адзначце тое, якое павінна быць ужыта ў адным са сказаў 2–5:

а) кветкавай; б) ганаровая; в) яблыневага; г) явачнай; д) другасны.

**Заданне 3.** Знайдзіце ў 11-м сказе тэксту немэтазгодна (збыткоўна) выкарыстанае слова, якое парушае правільнасць маўлення.

**Заданне 4.** Знайдзіце ў 4-м сказе тэксту прыназоўнік.

**Заданне 5.** Пастаўце падкрэслены ў 7-м сказе тэксту назоўнік у форму давальнага склону адзіночнага ліку.

**Заданне 6.** Ад назоўніка, падкрэсленага ў 8-м сказе тэксту, утварыце прыметнік пры дапамозе суфікса *-ск-*. Пастаўце гэты прыметнік у форму назоўнага склону адзіночнага ліку мужчынскага роду.

**Заданне 7.** Пастаўце падкрэслены ў 3-м сказе тэксту займеннік у форму роднага склону.

**Заданне 8.** Ад асновы дзеяслова, падкрэсленага ў 11-м сказе тэксту, утварыце дзеепрыслоўе.

**Заданне 9.** Вызначце, ад якога слова і якім спосабам утворана падкрэсленае ў 1-м сказе тэксту прыслоўе.

**Заданне 10.** У 14-м сказе тэксту знайдзіце слова з марфалагічнай памылкай. Выпраўце памылку.

**Заданне 11.** У 5-м сказе тэксту знайдзіце слова з арфаграфічнай памылкай. Выпраўце памылку.

**Заданне 12.** Вызначце стыль і тып тэксту.

## Стары

1) Стары ляжаў на канапе ў адбітым посцілкаю кутку і слухаў радыё. 2) Ён навучыўся пазнаваць шмат якія мелодыі, што прыходзілі да яго, як даўнія добрыя сябры. 3) Імёны кампазітараў, якія ён раней не

запамінаў, сёння нешта паўставалі ў яго памяці. 4) Стары па музыцы стараўся ўявіць сабе твар кампазітара, адгадаць, што ён думаў, калі складаў сваю музыку.

5) Па радыё выконвалася п’еса Шумана. 6) Мелодыя лілася светлая і лёгкая, і стары адразу намаляваў у думках твар кампазітара: малады і рухавы, з тонкімі рысамі, з яснымі летуценнымі вачамі. 7) Кампазітар углядаўся некуды ў далеч, і стары здагадаўся: гэта ён выглядае сваю каханую.

8) Стары паддаўся настрою кампазітара – праз музыку ажылі былые пачуцці. 9) Ён атчуваў сябе ў далёкай маладосці, бачыў сцяжыначку над Сожам і ўяўляў, як па той сцяжынцы ў лесе са смехам бяжыць бялявая дзяўчына. 10) А бор спяваў вакол дзяўчыны замілаваную песню, і наўсцяж слалася вясёлае летняе рэха. 11) Стары расхваляваўся, шчокі яго трохі разгладзіліся і паружавелі.

12) Але вось тая музыка скончылася, пачалі перадаваць нешта новае, у зусім новым настроі, і стары ўбачыў твар другога кампазітара. 13) То быў твар мужны і разам з тым нейкі занепакоены, на ім было напісана штосьці надта балючае, ад чаго старому стала не па сабе. 14) Аднак хутка стары зразумеў, што глыбокая задуменная плынь, мажліва, нават яшчэ больш імпануе яго настрою, і праніклíва ўслухаўся ў гукі. 15) Цяпер ён адчуў сябе ўжо не юнаком, а сталым і дужым чалавекам, які па-гаспадарску ішоў па зямлі, абдымаў вачамі шырокія прасцягі...

### *Заданні да тэксту*

**Заданне 1.** Знайдзіце ў тэксце дзеяслоў са значэннем ‘*адпавядаць чыім-небудзь патрабаванням, густам, настроям*; *выклікаць павагу*; *падабацца*’.

**Заданне 2.** У 11-м сказе тэксту знайдзіце сінонім да прыслоўя *крыху*.

**Заданне 3.** Адзначце словы-антонімы да падкрэсленага ў 6-м сказе тэксту прыметніка:

а) няспешны; б) павальны; в) марудны; г) жвавы; д) павольны.

**Заданне 4.** Вызначце, да якой часціны мовы адносіцца падкрэсленае ў 10-м сказе тэксту слова.

**Заданне 5.** Пастаўце падкрэслены ў 3-м сказе тэксту назоўнік у форму творнага склону адзіночнага ліку.

**Заданне 6.** Пастаўце падкрэслены ў 9-м сказе тэксту назоўнік у форму меснага склону адзіночнага ліку.

**Заданне 7.** Пастаўце падкрэслены ў 12-м сказе тэксту займеннік у форму назоўнага склону множнага ліку.

**Заданне 8.** Пастаўце падкрэслены ў 6-м сказе тэксту дзеяслоў у неазначальную форму.

**Заданне 9.** Вызначце, ад якога слова і якім спосабам утвораны падкрэслены ў 13-м сказе тэксту займеннік.

**Заданне 10.** У 8-м сказе тэксту знайдзіце слова з марфалагічнай памылкай. Выпраўце памылку.

**Заданне 11.** У 9-м сказе тэксту знайдзіце слова з арфаграфічнай памылкай. Выпраўце памылку.

**Заданне 12.** Вызначце стыль і тып тэксту.

## Пясняр Беларусі

1) У кожнага з нас ёсць свая калыска – мясціна, дзе давялося нарадзіцца, адкуль, як кажуць, пачаўся жыццёвы шлях. 2) Для нас гэта мясціна самая даражэйшая, самая любімая на зямлі. 3) Ды і не можа быць па-іншаму! 4) Яна аснова ўсяго, што ў нас ёсць і што будзе. 5) У кожнага народа, у кожнай краіне ёсць куточкі, якія з'яўляюцца духавымі сімваламі. 6) Тут нарадзіліся людзі, што сталі знакамітымі на ўласнай зямлі і ўзвысілі ў свеце свой народ, сваю радзіму. 7) У Беларусі такіх куткоў шмат. 8) Іх усе добра ведаюць і любяць. 9) Але адін, што ляжыць каля ракі Вязынкі, нам асабліва дарагі.

10) У Вязынцы, у найпрыгажэйшай вёсцы, а тады фальварку, 7 ліпеня 1882 года ў сям'і дробных арандатараў Луцэвічаў нарадзіўся будучы сусветна вядомы пясняр беларускага народа Янка Купала. 11) І хоць сям'я, не маючы сваёй зямлі, неўзабаве пакінула Вязынку ў пошуках лепшай долі, вёска застаецца яго, песняра, калыскай, а для нас – святыняй.

12) На Міншчыне ёсць нямала мясцін, звязаных з імем Янкі Купалы. 13) Яны пачатак яго жыццёвай дарогі. 14) Таму больш поўна зразумець геній паэта можна толькі тады, калі ты сэрцам дакранешся да ўсіх гэтых святынь. 15) І няхай у кожнага, хто прыйдзе да пачатковых вытокаў песняра па душэўнай патрэбе, складзецца добрае, шчаслівае жыццё ўсюды, куды прывядуць яго лёс і сэрца. 16) Адным словам, паўсюль сярод людзей.

### *Заданні да тэксту*

**Заданне 1.** У 10-м сказе тэксту знайдзіце сінонім да прыметніка *знакаміты.*

**Заданне 2.** У 6-м сказе тэксту знайдзіце антонім да прыметніка *агульны*.

**Заданне 3.** У адным са сказаў 1–6 тэксту знайдзіце лексічную памылку (няправільна ўжытае па значэнні слова). З прапанаваных слоў адзначце тое, якое павінна быць ужыта ў адным са сказаў 1–6:

а) свойская; б) выснова; в) асабовымі; г) духоўнымі; д) уласніцкай.

**Заданне 4.** Знайдзіце ў 15-м сказе тэксту немэтазгодна (збыткоўна) выкарыстанае слова, якое парушае правільнасць маўлення.

**Заданне 5.** Знайдзіце ў 9-м сказе тэксту прыназоўнік.

**Заданне 6.** Пастаўце падкрэслены ў 15-м сказе тэксту назоўнік у форму роднага склону адзіночнага ліку.

**Заданне 7.** Пастаўце падкрэслены ў 11-м сказе тэксту назоўнік у форму меснага склону адзіночнага ліку.

**Заданне 8.** Пастаўце падкрэслены ў 13-м сказе тэксту займеннік у форму творнага склону адзіночнага ліку.

**Заданне 9.** Ад назоўніка, падкрэсленага ў 16-м сказе тэксту, утварыце прыметнік пры дапамозе суфікса *-ск-*. Пастаўце гэты прыметнік у форму назоўнага склону адзіночнага ліку мужчынскага роду.

**Заданне 10.** У 2-м сказе тэксту знайдзіце слова з марфалагічнай памылкай. Выпраўце памылку.

**Заданне 11.** У 9-м сказе тэксту знайдзіце слова з арфаграфічнай памылкай. Выпраўце памылку.

**Заданне 12.** Вызначце стыль і тып тэксту.

## Душэўная цеплыня

1) Як і заўсёды ў красавіку, сёння Алеся з хваляваннем бегла да гаманлівай крынічкі, якая бурліла недалёка ад вёсцы. 2) Бегла яна, спадзеючыся, што на гэты раз журавы паселяцца каля чысцюткай вады. 3) Але, на жаль, іскрыстая крынічка так і не змагла іх прываражыць. 4) Алесі стала вельмі сумна, калі жураўліны клін на яе вачах праплыў, мінуўшы крынічную водную гладзь. 5) Настрой змяніўся толькі тады, калі яна ўспомніла пра лебедзя. 6) Ён (дзяўчынка была ў гэтым упэўнена) захоча наведаць прыгожую мясціну. 7) Гожая мясціна дапамагла ў бядзе. 8) Здарылася гэта пазалетась.

9) У адзін з зімовых дзён Алеся, прыйшоўшы са школы, яшчэ не паспела і <u>распрануцца</u>, як у хату ўбег яе малодшы брат Андрэйка і радасна ўсклікнуў:

– Да нас лебедзь прыляцеў! Хадзем падзівімся!

10) – А чаму ён не белы, а нейкі шэры? – здзівілася дзяўчынка, убачыўшы лебедзя.

11) – Малады, відаць, – адказаў брат. – Вырасце, стане белым.

12) Брат з сястрой ціхенька падкраліся да азяблай птушкі. 13) Аднак лебедзь пачуў чужыя крокі, насцярожыўся і ўзляцеў. 14) Праз хвіліну птах апусціўся.

15) – Слабы, – уздыхнуў Андрэйка, – сілы ў крылах няма. І ад крынічкі ён далёка не паляціць, бо рэкі і азёры пазамярзалі. Неяк перазімуе, толькі зараз з ежай кепска. Будзем яго падкармліваць.

16) З гэтага часу Алеся двойчы на дзень прыбягала да крынічкі, прыносячы птушцы то свежы хлеб, то пшаніцу, то вараную бульбу. 17) Спачатку лебедзь дзічыўся, не падпускаў да сябе, адлятаў далей ад берага. 18) Тады Алеся кідала ў ваду хлеб ці ставіла на лёд шкляны слоік з пшаніцай. 19) Нарэшце ён перастаў дзічыцца чалавека. 20) Птушка адчула людскую ласку, цяплыню і клопат.

### *Заданні да тэксту*

**Заданне 1.** У адным са сказаў 10–14 тэксту знайдзіце слова, якое мае значэнне ‘*які настыў, змёрз на холадзе*’.

**Заданне 2.** У 15-м сказе тэксту знайдзіце антонім да прыслоўя *добра*.

**Заданне 3.** Знайдзіце ў 20-м сказе тэксту слова, у якім ёсць гук [ц].

**Заданне 4.** Пастаўце падкрэслены ў 20-м сказе тэксту назоўнік у форму роднага склону адзіночнага ліку.

**Заданне 5.** Знайдзіце ў 1-м сказе тэксту прыметнік і пастаўце яго ў форму назоўнага склону адзіночнага ліку мужчынскага роду.

**Заданне 6.** Пастаўце падкрэслены ў 16-м сказе тэксту займеннік у форму назоўнага склону множнага ліку.

**Заданне 7.** Знайдзіце ў 3-м сказе тэксту інфінітыў.

**Заданне 8.** Ад асновы дзеяслова, падкрэсленага ў 9-м сказе тэксту, утварыце поўны дзеепрыметнік і пастаўце яго ў форму назоўнага склону множнага ліку.

**Заданне 9.** Вызначце, ад якога слова і якім спосабам утворана падкрэсленае ў 17-м сказе тэксту прыслоўе.

**Заданне 10.** У 1-м сказе тэксту знайдзіце слова з марфалагічнай памылкай. Выпраўце памылку.

**Заданне 11.** У 20-м сказе тэксту знайдзіце слова з арфаграфічнай памылкай. Выпраўце памылку.

**Заданне 12.** Вызначце стыль і тып тэксту.

## Бортніцтва ў Беларусі

1) Пра пчол беларусы ведалі са старажытнасці. 2) Спачатку прашчуры выпадкова знаходзілі пчаліныя гнёзды ў дуплах дрэў і забіралі мёд разам з сотамі. 3) Карыснасць смачнага рэчыва стала відавочнай, але часу на яго збіранне трацілася вельмі многа, а здабыча была невялікая. 4) Далёкіх нашых продкаў перастае задавальняць выпадкова знойдзены мёд, бо яго хацелася есці круглы год. 5) Каб прыручыць руплівых пчолак і мець гарантаваны прыбытак, яны, змайстраваўшы ў дрэвах борці (дуплы), пачынаюць займацца бортніцтвам.

6) Станаўленне бортніцтва адбылося ў першым стагоддзі нашай эры, пра што сведчаць словы «мёд», «воск», «труцень», якія ўжываюцца ва ўсіх славянскіх мовах. 7) Класічную форму бортніцтва набыло пасля з'яўлення жалезных прылад працы, калі бортнік змог выдзёўбваць борці ў сырых ствалах дрэў. 8) Гэты лясны промысел удалося добра наладзіць у адным з самых цікавых куточкаў нашага края – на беларускім Палессі.

9) Для борці паляшук выбіраў высокае дрэва на паляне, каб яго было відаць адусюль. 10) Найчасцей выбіралася сасна: на елцы пчолы не сяліліся, а дуб цяжка апрацоўваўся. 11) Дакладнае дзейства суправаджала бортніка ў час падрыхтоўкі борці: ён не піў, не еў нічога тлустага і трымаў у сакрэце сваю задуму. 12) Праца бортніка патрабавала вялікіх практычных ведаў, спрыту і фізічных сіл. 13) На дрэва ён ўзбіраўся пры дапамозе спецыяльнай прылады – лезіва. 14) Доўгія гадзіны вісеў высока над зямлёй, выдзёўбваючы сабе борці. 15) Кожная з іх абавязкова мела своеасаблівы знак – кляймо або сцяг. 16) Высечаны бортнікам на ўсходнім баку дрэва … знак пацвярджаў яго права на борць. 17) Прафесія бортніка перадавалася ад бацькі да сына, які з дзяцінства павінен быў пазнаць таямніцы дзіўнага старажытнага рамяства.

### *Заданні да тэксту*

**Заданне 1.** У адным са сказаў 2–6 тэксту знайдзіце слова, якое мае значэнне '*набыццё пэўных прымет у працэсе развіцця*; *фарміраванне*'.

**Заданне 2.** Адзначце словы, якія могуць быць ужыты на месцы пропуску ў 16-м сказе тэксту:

а) адметны; б) знакаміты; в) дасведчаны; г) характэрны; д) разборны.

**Заданне 3.** У 4-м сказе тэксту знайдзіце антонім да назоўніка *сучаснікі*.

**Заданне 4.** Пастаўце падкрэслены ў 11-м сказе тэксту назоўнік у форму давальнага склону адзіночнага ліку.

**Заданне 5.** Пастаўце падкрэслены ў 3-м сказе тэксту прыметнік у форму назоўнага склону адзіночнага ліку ніякага роду.

**Заданне 6.** Пастаўце падкрэслены ў 15-м сказе тэксту займеннік у форму назоўнага склону адзіночнага ліку мужчынскага роду.

**Заданне 7.** Ад асновы дзеяслова, падкрэсленага ў 17-м сказе тэксту, утварыце дзеепрыслоўе.

**Заданне 8.** У адным са сказаў 12–14 тэксту знайдзіце прыслоўе.

**Заданне 9.** Вызначце, ад якога слова і якім спосабам утвораны падкрэслены ў 2-м сказе тэксту прыметнік.

**Заданне 10.** У 8-м сказе тэксту знайдзіце слова з марфалагічнай памылкай. Выпраўце памылку.

**Заданне 11.** У 13-м сказе тэксту знайдзіце слова з арфаграфічнай памылкай. Выпраўце памылку.

**Заданне 12.** Вызначце стыль і тып тэксту.

## Беларускі ручнік

1) Беларускі ручнік адносіцца да тых прадметаў мастацтва, што належаць і мінуламу, і сучаснасці. 2) Ён прысутнічае ў самыя важныя моманты жыцця гарадскога і вясковага чалавека. 3) Мы можам убачыць гэту дзіўную ўзорыстую тканіну там, дзе святкуюць радзіны ці вяселле. 4) Ніводная значная выстава народнага мастацтва не абыходзіцца зараз без ручніка, бо ён найбольш ярка перадае рысы нацыянальнага арнаменту, увасабляе высокае майстэрства ткацтва, вышыўкі і вязання.

5) Шмат стагоддзяў карыстаюцца беларусы ручніком. 6) Ткуць і расшываюць яго і сёння, імкнучыся кожны раз удасканаліць прыгажосць, над якой працавала мноства папярэдніх пакаленняў. 7) Кожнае з іх, спасцігаючы законы аздаблення тканіны, асэнсоўвала і складвала ў адзіную скарбонку разуменне ручніковага дэкора, розных тэхнічных прыёмаў, адметных каляровых спалучэнняў. 8) З часам адточваліся характэрныя адзнакі традыцыйнага аздаблення беларускага ручніка. 9) Фарміраваўся канон, у рамках якога праходзілі далейшыя творчыя пошукі. 10) Канон ніколі не абмяжоўваў ткачыху, вышывальшчыцу, а дазваляў увасабляць у арнаменце свой характар,

пачуцці, настрой, сваё адчуванне хараства, дэманстраваць рамесніцкую дасканаласьць.

11) Так ствараўся ручнік – цудоўны выраб калектыўнай працы і індывідуальнага бачання, традыцыйнага і заўсёды новага мастацтва. 12) Кожная ткачыха, беручыся за справу, клапацілася, каб яе палатно было адметнае, прыгожае. 13) І яно часта ўдавалася нават лепшым.

### *Заданні да тэксту*

**Заданне 1.** У адным са сказаў 5–7 тэксту знайдзіце слова, якое мае значэнне ‘*своеасаблівы, характэрны*’.

**Заданне 2.** У адным са сказаў 11–13 тэксту знайдзіце антонім да прыметніка *горшы*.

**Заданне 3.** Знайдзіце ў 2-м сказе тэксту слова, у якім ёсць гук [ц].

**Заданне 4.** Пастаўце падкрэслены ў 10-м сказе тэксту назоўнік у форму роднага склону адзіночнага ліку.

**Заданне 5.** Пастаўце падкрэслены ў 6-м сказе тэксту прыметнік у форму назоўнага склону адзіночнага ліку мужчынскага роду.

**Заданне 6.** Пастаўце падкрэслены ў 1-м сказе тэксту займеннік у форму творнага склону множнага ліку.

**Заданне 7.** Ад асновы дзеяслова, падкрэсленага ў 3-м сказе тэксту, утварыце поўны дзеепрыметнік і пастаўце яго ў форму назоўнага склону множнага ліку.

**Заданне 8.** Вызначце, якой часцінай мовы з’яўляецца падкрэсленае ў 11-м сказе тэксту слова.

**Заданне 9.** Вызначце, ад якога слова і якім спосабам утвораны падкрэслены ў 12-м сказе тэксту назоўнік.

**Заданне 10.** У 7-м сказе тэксту знайдзіце слова з марфалагічнай памылкай. Выпраўце памылку.

**Заданне 11.** У 10-м сказе тэксту знайдзіце слова з арфаграфічнай памылкай. Выпраўце памылку.

**Заданне 12.** Вызначце стыль і тып тэксту.

## Прыгажосць роднай зямлі

1) Успамінаю возера Свіцязь каля Навагрудка, яго ласкавую ваду, чародкі паласатых, нібы празрыстых, акунёў, якія гуляюць на мелізне. 2) Навокал зялёныя трысцё, клёны, дубы ды ліпы, што надумалі сваім цветам аздобіць ваду ля самага берага.

3) Успамінаю раку Бярозу, у ляску каля якой ярка гарэла ўсю ноч толькі наша рыбацкае вогнішча. 4) Як на світанні мы, ідучы да Бярозы, пракладалі на росным лузе першую сцежку.

5) Успамінаю цудоўнае возера Нарач, спакойны, велічны Сож, быстры Нёман і ціхія рэчкі, якіх я нямала бачыў, вандраваўшы па роднай краіне. 6) Успамінаю сустрэчу з той лясной крынічкай, што бліскучай стужкай імкліва віхляла сярод векавых дрэў дрымучага лесу. 7) Жыватворную сілу яе чыстай і незвычайна смачнай вады. 8) Успамінаю спатканне з крынічкай як бясплатны падарунак, як сапраўднае счасце.

9) Успамінаю і разумею: паўсюль перад намі раскрыта цудоўная кніга – прырода роднай краіны. 10) Чытайце гэту кнігу, смела заглыбляйцеся ў яе таямніцы, бярыце шчодрую матчыну ласку ад промняў сонца, ад плёскату празрыстых хваляў, ад сасновага шуму, ад самага духмянага ва ўсім свеце спелага збожжа.

## *Заданні да тэксту*

**Заданне 1.** У 9-м сказе тэксту знайдзіце сінонім да дзеяслова *ўзгадваць*.

**Заданне 2.** Знайдзіце ў 8-м сказе тэксту немэтазгодна (збыткоўна) выкарыстанае слова, якое парушае правільнасць маўлення.

**Заданне 3.** Знайдзіце ў 3-м сказе тэксту часціцу.

**Заданне 4.** Пастаўце падкрэслены ў 9-м сказе тэксту назоўнік у форму давальнага склону адзіночнага ліку.

**Заданне 5.** Пастаўце падкрэслены ў 5-м сказе тэксту прыметнік у форму творнага склону множнага ліку.

**Заданне 6.** Пастаўце падкрэслены ў 6-м сказе тэксту займеннік у форму назоўнага склону множнага ліку.

**Заданне 7.** Ад асновы дзеяслова, падкрэсленага ў 2-м сказе тэксту, утварыце поўны дзеепрыметнік залежнага стану і пастаўце яго ў форму назоўнага склону адзіночнага ліку мужчынскага роду.

**Заданне 8.** У адным са сказаў 5–10 тэксту вызначце слова, форма якога не адпавядае марфалагічнай ці арфаграфічнай норме. З прапанаваных слоў адзначце тое, якое павінна быць ужыта ў адным са сказаў 5–10:

а) вандруючы; б) заглыбляйцесь; в) маччыну; г) шума; д) самога.

**Заданне 9.** Вызначце, ад якога слова і якім спосабам ўтвораны падкрэслены ў 3-м сказе тэксту назоўнік.

**Заданне 10.** У 2-м сказе тэксту знайдзіце слова з марфалагічнай памылкай. Выпраўце памылку.

**Заданне 11.** У 8-м сказе тэксту знайдзіце слова з арфаграфічнай памылкай. Выпраўце памылку.

**Заданне 12.** Вызначце стыль і тып тэксту.

## Вёска

1) «Ах, якое сёння цудоўнае надворье! Ні ветру, ні хмурынкі!» – радаваўся ўголас дзядзька Мартын, павольна ішоўшы ад вакзальнай плошчы ў вёску, дзе жыве яго даўні сябар. 2) Ранішняе сонца спачатку няспешнымі хвалямі кацілася па зямлі, пасля сонечныя хвалі паступова збягалі да вады і збіраліся ў рачным люстры.

3) Вясковыя хаты ляпіліся на самым высокім месцы, і калі дзядзька Мартын глянуў на вёску знізу, з ракі, то заўважыў, як вымалёўваюцца ў нябеснай яснасці побач з абрысамі дрэў коміны на стрэхах. 4) Стрэхі ішлі роўненька, адна за адной, высокія, у асноўным шыферныя, а вось коміны адрозніваліся. 5) Невядома чаму, але кожны з вяскоўцаў комін у сябе пажадаў <u>змайстраваць</u> іншы, чым у суседа. 6) І добра, што печнікі былі людзі з выдумкай. 7) Адзін комін, шырокі, прысадзісты, вылазіў на <u>страху</u>. 8) Быў ён важны, як, відаць, і яго гаспадар. 9) Другі вытыркаўся доўгай і тонкай жалезнай трубой. 10) І выгляд меў такі, быццам упершыню трапіў на <u>гэты</u> свет ды назаўсёды застыў у нямым здзіўленні. 11) У трэцяга над трубой быў прышлёпнуты шырокі брыль. 12) Коміны ганарыста красаваліся над берагавым грэбенем, узнімаліся над садамі і агародамі, што спаўзалі да ракі.

13) Сады яшчэ і цяпер, у ліпені, выдавалі ацяжэлымі: моцна прыціснула кусты і дрэвы густая лістота. 14) Адцвіла бульба, стаяла роўная і <u>кучаравая</u>, яшчэ ківаліся на межах у жоўтых хусцінках сланечнікі, а на градках даўно ўжо тырчэлі вострымі каліўцамі цыбуля і часнок. 15) Палюбаваўшыся на хаты, сады і агароды, дзядзька ў добрым настрою пайшоў па вузенькай, што шнурок, сцежачцы, якая ўсё далей адводзіла яго ад рэйкавай чыгункі і набліжала да вёскі.

### *Заданні да тэксту*

**Заданне 1.** У 1-м сказе тэксту знайдзіце сінонім да прыметніка *добры*.

**Заданне 2.** У 13-м сказе тэксту знайдзіце антонім да прыметніка *рэдкі*.

**Заданне 3.** Знайдзіце ў 15-м сказе тэксту немэтазгодна (збыткоўна) выкарыстанае слова, якое парушае правільнасць маўлення.

**Заданне 4.** Знайдзіце ў 4-м сказе тэксту часціцу.

**Заданне 5.** Пастаўце падкрэслены ў 7-м сказе тэксту назоўнік у форму меснага склону адзіночнага ліку.

**Заданне 6.** Пастаўце падкрэслены ў 14-м сказе тэксту прыметнік у форму творнага склону адзіночнага ліку жаночага роду.

**Заданне 7.** Пастаўце падкрэслены ў 10-м сказе тэксту займеннік у форму назоўнага склону множнага ліку.

**Заданне 8.** Ад асновы дзеяслова, падкрэсленага ў 5-м сказе тэксту, утварыце поўны дзеепрыметнік залежнага стану і пастаўце яго ў форму назоўнага склону адзіночнага ліку мужчынскага роду.

**Заданне 9.** У адным са сказаў 1–5 тэксту вызначце слова, форма якога не адпавядае марфалагічнай ці арфаграфічнай норме. З прапанаваных слоў адзначце тое, якое павінна быць ужыта ў адным са сказаў 1–5:

а) ветра; б) ідучы; в) вагзальнай; г) кацілась; д) кажны.

**Заданне 10.** У 15-м сказе тэксту знайдзіце слова з марфалагічнай памылкай. Выпраўце памылку.

**Заданне 11.** У 1-м сказе тэксту знайдзіце слова з арфаграфічнай памылкай. Выпраўце памылку.

**Заданне 12.** Вызначце стыль і тып тэксту.

## Ластаўкі

1) Прыгатаваўшы ранішняе снеданне, бабка Волька выйшла на вуліцу і прысела на зручную лавачку, якую ёй учора змайстраваў унук Міколка. 2) На прасторнай вуліцы было ціха, толькі чуўся неўгамоны шчэбет ластавак. 3) «Ого, колькі іх зляцелася ў адзін гурт! Значыць, збіраюцца не сёння-заўтра пакінуць нас», – падумала ўголас Волька.

4) Шукаючы, відаць, сабе спажыву, зусім нізка, амаль над самым долам, шумныя ластаўкі каторую гадзіну так спрытна насіліся туды-сюды, што цяжка было іх разгледзець. 5) Але вось, налятаўшыся, птушкі густа паселі на тэлеграфны провад. 6) Ледзь чутныя зараз і такія мілыя галасы не маглі не выклікаць у душы бабкі шчымлівага суму. 7) Волька доўга не адводзіла вачэй ад жывой гірлянды на тэлеграфным проваду, якую нагадвалі, шчыльна ўсеўшыся, каб перамагчы холад, птушкі. 8) Бабцы хацелася наглядзецца на ластавак перад іх адлётам у вырай. 9) Толькі ўспомніўшы, што збіралася зранку паставіць у печ пірагі, Волька падхапілася і хуценька пайшла ў хату.

10) Ластаўкі, амаль справіўшыся з холадам, увішна чысцілі дзюбамі пёркі на крылах ды дружна шчабяталі. 11) Здавалася, птушкі нешта вырашалі, аб нечым раіліся. 12) Часам узляталі (праўда, невысока) і зараз жа вярталіся на сваё ранейшае месца. 13) Жывая гірлянда доўга ўпрыгожвала тэлеграфны провад. 14) Халодны дзень закончыўся, аднак надышла не менш халодная <u>ноч</u>. 15) А калі ноч зноў змяніў ранак, ластавак нідзе не было відаць. 16) «Каб менш мы, людзі, шкадавалі, выправіліся вы, даражэнькія, у дарогу яшчэ зацемна», – уздыхнуўшы, прамовіла Волька.

## *Заданні да тэксту*

**Заданне 1.** У 9-м сказе тэксту знайдзіце антонім да прыслоўя *марудна*.

**Заданне 2.** Знайдзіце ў 1-м сказе тэксту немэтазгодна (збыткоўна) выкарыстанае слова, якое парушае правільнасць маўлення.

**Заданне 3.** Знайдзіце ў 12-м сказе тэксту часціцу.

**Заданне 4.** Пастаўце падкрэслены ў 1-м сказе тэксту назоўнік у форму давальнага склону адзіночнага ліку.

**Заданне 5.** Ад назоўніка, падкрэсленага ў 14-м сказе тэксту, утварыце прыметнік пры дапамозе суфікса *-н-*. Пастаўце гэты прыметнік у форму назоўнага склону адзіночнага ліку мужчынскага роду.

**Заданне 6.** Пастаўце падкрэслены ў 4-м сказе тэксту займеннік у пачатковую форму.

**Заданне 7.** Ад асновы дзеяслова, падкрэсленага ў 9-м сказе тэксту, утварыце поўны дзеепрыметнік залежнага стану і пастаўце яго ў форму назоўнага склону адзіночнага ліку мужчынскага роду.

**Заданне 8.** Ад асновы дзеяслова, падкрэсленага ў 8-м сказе тэксту, утварыце дзеепрыслоўе.

**Заданне 9.** У адным са сказаў 4–6 тэксту вызначце слова, форма якога не адпавядае марфалагічнай норме. З прапанаваных слоў адзначце тое, якое павінна быць ужыта ў адным са сказаў 4–6:

а) сабе; б) разгледзіць; в) тэлеграфный; г) бабцы; д) сума.

**Заданне 10.** У 7-м сказе тэксту знайдзіце слова з марфалагічнай памылкай. Выпраўце памылку.

**Заданне 11.** У 2-м сказе тэксту знайдзіце слова з арфаграфічнай памылкай. Выпраўце памылку.

**Заданне 12.** Вызначце стыль і тып тэксту.

## Граматыка Браніслава Тарашкевіча

1) Вясной 1916 года жаданне напісаць беларускую граматыку цалкам авалодала свядомасцю Браніслава Тарашкевіча. 2) Граматыка патрэбна была як паветра. 3) І малады вучоны разумеў, што гэта яго святы абавязак.

4) Нельга сказаць, што задума ўзнікла неяк выпадкова, на пустым месце. 5) Адзін з буйных беларусазнаўцаў Яўхім Фёдаравіч Карскі ў сваей фундаментальнай працы «Беларусы» даследаваў і апісаў фанетыку і марфалогію беларускай мовы. 6) Яўхім Карскі прааналізаваў вялікі фактычны матэрыял, але не ўсё задуманае ажыцявіў. 7) Свайму ж вучню, Браніславу Тарашкевічу, ён ахвотна дапамагаў у нялёгкай і адначасова вельмі важнай справе. 8) У выніку вучоны абагульніў асноўныя факты, моўныя з’явы цэнтральных беларускіх гаворак. 9) Яму заставалася толькі выпрацаваць беларускую лінгвістычную тэрміналогію.

10) Граматыка Браніслава Тарашкевіча складалася з пяці невялікіх раздзелаў і была прызначана перш за ўсё для практычнага выкарыстання ў школе. 11) Даследчык свядома на першым этапе не ўскладняў тэорыі. 12) Сярод іншых яго задум была і такая: абавязкова працягнуць напісанне «навуковай граматыкі».

13) Сёння Браніслаў Тарашкевіч з’яўляецца прызнаным у свеце лінгвістам, а ўнармаваны ім арфаграфічны правапіс лёг у аснову адпаведных нормаў беларускай літаратурнай мовы.

### *Заданні да тэксту*

**Заданне 1.** Знайдзіце ў тэксце фразеалагізм.

**Заданне 2.** Знайдзіце ў 13-м сказе тэксту немэтазгодна (збыткоўна) выкарыстанае слова, якое парушае правільнасць маўлення.

**Заданне 3.** Знайдзіце ў 12-м сказе тэксту прыназоўнік.

**Заданне 4.** Пастаўце падкрэслены ў 3-м сказе тэксту назоўнік у форму роднага склону адзіночнага ліку.

**Заданне 5.** Пастаўце падкрэслены ў 6-м сказе тэксту прыметнік у простую форму вышэйшай ступені параўнання (назоўны склон, адзіночны лік, мужчынскі род).

**Заданне 6.** Пастаўце падкрэслены ў 12-м сказе тэксту займеннік у форму назоўнага склону множнага ліку.

**Заданне 7.** Ад асновы дзеяслова, падкрэсленага ў 9-м сказе тэксту, утварыце дзеепрыслоўе.

**Заданне 8.** Вызначце, якім спосабам утвораны падкрэслены ў 5-м сказе тэксту назоўнік.

**Заданне 9.** У адным са сказаў 4–7 тэксту вызначце слова, форма якога не адпавядае марфалагічнай ці арфаграфічнай норме. З прапанаваных слоў адзначце тое, якое павінна быць ужыта ў адным са сказаў 4–7:

а) ніяк; б) пустым; в) сваёй; г) даследваў.

**Заданне 10.** У 4-м сказе тэксту знайдзіце слова з марфалагічнай памылкай. Выпраўце памылку.

**Заданне 11.** У 6-м сказе тэксту знайдзіце слова з арфаграфічнай памылкай. Выпраўце памылку.

**Заданне 12.** Вызначце стыль і тып тэксту.

## Балотная курачка

1) Праразаючы вострым носам байдаркі светла-зялёную сцяну чарота ды адштурхоўваючыся вяслом, Андрэй змог хуценька прабрацца ў ціхую неглыбокую рэчку, па якой і паплыў.

2) Дзесьці праз паўгадзіны сярод забалочаных лугавін, хмызняку і розных нізкарослых дрэў перад ім адкрылася невялікае азярцо, акаймаваная чаротам. 3) Тут гнездзіліся балотныя курачкі, лысухі, чомгі, шматлікія кулікі і ажно тры віды качак: крыжанкі, чыркі, ныркі. 4) Плывучы, хлопец добра чуў, як у чароце меладычна спяваюць, стараючыся пераймаць салаўя, сціплыя чарацянкі. 5) А дзе-нідзе яму даводзілася бачыць рэшткі шкарлупіння ад яек балотных і вадаплаўных птушак. 6) Андрэй разумеў, што гэта непрыгожыя сляды разбойніцкай дзейнасці балотнага луня.

7) Раптам на лісціку гарлачыка ён заўважыў чорную птушку, велічынёю з голуба. 8) То была чаротніца, якую яшчэ называюць вадзяной і балотнай курачкай. 9) Усе яе блізкія і далёкія сваякі спрытна бегаюць па пяску, па траве, па балотнай дрыгве. 10) Яна ж, як і лысуха, можа лётаць і плаваць.

11) Андрэй з цікавасцю назіраў за тым, як, прыкмеціўшы чалавека, уцякала ад яго вадзяная курачка. 12) Птушка адштурхоўвалася ад вады вялікімі лапамі з доўгімі пальцамі і шпарка махала кароткімі крыламі. 13) На паверхні вады за ёю заставаўся, расплываючыся праз нейкі час, цэлы ланцужок кругоў. 14) «Вось табе і курыца! Бегае па вадзе, нібыта футбаліст па полі», – засмяяўся хлопец. 15) Андрэй падумаў, што людзі, відаць, усё ж памылкова называюць курачкай гэту дзіўную балотную птушку.

### *Заданні да тэксту*

**Заданне 1.** У 12-м сказе тэксту знайдзіце сінонім да прыслоўя *хутка*.

**Заданне 2.** Знайдзіце ў 9-м сказе тэксту немэтазгодна (збыткоўна) выкарыстанае слова, якое парушае правільнасць маўлення.

**Заданне 3.** Знайдзіце ў 3-м сказе тэксту часціцу.

**Заданне 4.** Пастаўце падкрэслены ў 12-м сказе тэксту назоўнік у форму давальнага склону адзіночнага ліку.

**Заданне 5.** Пастаўце падкрэслены ў 8-м сказе тэксту прыметнік у форму назоўнага склону адзіночнага ліку мужчынскага роду.

**Заданне 6.** Пастаўце падкрэслены ў 13-м сказе тэксту займеннік у форму роднага склону адзіночнага ліку мужчынскага роду.

**Заданне 7.** Вызначце дзеяслоў, ад асновы якога ўтворана падкрэсленае ў 11-м сказе тэксту дзеепрыслоўе.

**Заданне 8.** Вызначце, якой часцінай мовы з’яўляецца падкрэсленае ў 6-м сказе тэксту слова.

**Заданне 9.** У адным са сказаў 1–5 тэксту знайдзіце слова, форма якога не адпавядае марфалагічнай ці арфаграфічнай норме. З прапанаваных слоў адзначце тое, якое павінна быць ужыта ў адным са сказаў 1–5:

а) чароту; б) разных; в) акаймаватае; г) плыўшы; д) дзе-недзе.

**Заданне 10.** У 2-м сказе тэксту знайдзіце слова з марфалагічнай памылкай. Выпраўце памылку.

**Заданне 11.** У 3-м сказе тэксту знайдзіце слова з арфаграфічнай памылкай. Выпраўце памылку.

**Заданне 12.** Вызначце стыль і тып тэксту.

### Сіла слова

1) Наколькі я патрабавальны да выбару слоў у час размовы або пісьма, наколькі ўважлівы? 2) Ці задавалі вы сабе такое пытанне? 3) Яно важнае, бо слова – гэта нешта значна большае, чым знак, чым сімвал. 4) Слова мае вялікую сілу.

5) Кожнае слова напоўнена значэннем (часта не адным), кожнае дзеліцца не толькі з тым, хто слухае, але і з тым, хто гаворыць, сілай заключанага ў ім значэння. 6) І вось тут асцярожна: вельмі небяспечна часта паўтараць ды і увогуле ўжываць у маўленні непрыемныя,

напышлівыя, суровыя словы, каб не захаваць іх назаўжды ў сваёй свядомасці. 7) Перад тым як нешта сказаць, добра падумайце.

8) Выбар для ўзаемаадносін мілагучных, шчырых, далікатных слоў – самы першы і важны крок. 9) Пазбягайце неапраўдана гукавых слоў, гаварыце так, каб нікога не пакрыўдзіць. 10) Знаходзьце словы, якія дазволяць пачуць і зразумець вас, дапамогуць абмеркаваць любую сітуацыю, рашыць любую праблему. 11) Словы, якія стымулююць каго-небудзь да ажыццяўлення мары і за якія хтосьці вам будзе ўдзячны.

12) Пастаянна падбіраць правільныя словы нялёгка, асабліва спачатку. 13) Але з часам прыходзіць уменне, яно перарастае ў навык і нават у нешта большае – у патрэбную неабходнасць. 14) У неабходнасць штораз казаць самаму сабе: «Сёння я думаў і гаварыў настолькі хораша, што змог дапамагчы чалавеку!»

### *Заданні да тэксту*

**Заданне 1.** У 5-м сказе тэксту знайдзіце сінонім да назоўніка *семантыка*.

**Заданне 2.** У 12-м сказе тэксту знайдзіце антонім да прыметніка *памылковы*.

**Заданне 3.** У адным са сказаў 6–9 тэксту знайдзіце лексічную памылку (няправільна ўжытае па значэнні слова). З прапанаваных слоў адзначце тое, якое павінна быць ужыта ў адным са сказаў 6–9:

а) бяспечна; б) далікатэсных; в) першасны; г) гучных; д) крыўдаваць.

**Заданне 4.** Знайдзіце ў 13-м сказе тэксту немэтазгодна (збыткоўна) выкарыстанае слова, якое парушае правільнасць маўлення.

**Заданне 5.** Знайдзіце ў 3-м сказе тэксту часціцу.

**Заданне 6.** Пастаўце падкрэслены ў 6-м сказе тэксту назоўнік у форму творнага склону адзіночнага ліку.

**Заданне 7.** Ад назоўніка, падкрэсленага ў 14-м сказе тэксту, утварыце прыметнік пры дапамозе суфікса *-н-*. Пастаўце гэты прыметнік у форму назоўнага склону адзіночнага ліку мужчынскага роду.

**Заданне 8.** Пастаўце падкрэслены ў 9-м сказе тэксту займеннік у пачатковую форму.

**Заданне 9.** Ад асновы дзеяслова, падкрэсленага ў 7-м сказе тэксту, утварыце поўны дзеепрыметнік залежнага стану і пастаўце яго ў форму назоўнага склону адзіночнага ліку мужчынскага роду.

**Заданне 10.** У 14-м сказе тэксту знайдзіце слова з марфалагічнай памылкай. Выпраўце памылку.

**Заданне 11.** У 6-м сказе тэксту знайдзіце слова з арфаграфічнай памылкай. Выпраўце памылку.

**Заданне 12.** Вызначце стыль і тып тэксту.

**Міжнародны дзень роднай мовы**

1) 21 лютага ва ўсім свеце адзначаецца Міжнародны дзень роднай мовы. 2) Гэта свята было абвешчана ЮНЕСКА па ініцыятыве краіны Бангладэш і праводзіцца штогод з 2000 года. 3) Гісторыя свята сумная: 21 лютага 1952 года ў горадзе Дака, сталіцы Бангладэш, загінулі пяць студэнтаў, якія адстойвалі права прызнаць родную для іх бенгальскую мову дзяржаўнай.

4) Мэта свята – захаванне лінгвістычнай разнастайнасці і шматмоўя ў сучасным свеце, падтрыманне нацыянальных моў і культур, забеспячэнне права кожнага грамадзяніна карыстацца роднай мовай.

5) Сёння на лінгвістычнай карце налічваецца каля 6 тысяч моў, але палова з іх, паводле ацэнкі ЮНЕСКА, знаходзіцца пад пагрозай знікнення, а больш за 200 лічацца мёртвымі. 6) Тысячы моў не выкарыстоўваюцца ў сістэме адукацыі. 7) Кожныя 2 тыдні ў свеце знікае адна мова, і гэты лёс, як лічаць даследчыкі, можа напаткаць палову моў свету да канца XXI стагоддзя. 8) ЮНЕСКА мае намер стварыць сістэму адсочвання стану моў, якія знаходзяцца пад пагрозай знікнення, і садзейнічаць выпраўленню становішча. 9) На 40 найбольш распаўсюджаных мовах сёння размаўляюць каля 2/3 насельніцтва Зямлі, а 96 % моў свету карыстаюцца толькі 3 % людзей. 10) У дзясятку самых ужывальных па колькасці носьбітаў сёння ўваходзяць наступныя мовы: кітайская, іспанская, англійская, хіндзі, арабская, бенгальская, партугальская, руская, японская, лахнда.

11) Спецыялісты адзначаюць: раней мова знікала натуральным шляхам, у выніку гібелі народа (праз эпідэміі, войны), а сёння носьбіты добраахвотна пераходзяць на іншую мову. 12) Асноўнай прычынай знікнення моў у сучасным свеце вучоныя называюць глабалізацыю і міграцыю. 13) Эканамічныя працэсы вымушаюць людзей пакідаць родныя мясціны, шукаць працу ў вялікіх гарадах, іншых краінах, дзе яны адмаўляюцца ад роднай мовы і пачынаюць карыстацца іншымі, больш папулярнымі.

14) Міжнародны дзень роднай мовы – адна з нагод падумаць пра лёс роднай мовы. 15) У гэты дзень усе мовы прызнаюцца роўнымі, бо

кожная з іх з’яўляецца унікальнай спадчынай, якую мы павінны захаваць для нашчадкаў. 16) Гісторыя ведае шматлікія прыклады таго, як са знікненнем мовы знікае этнас, нацыя.

17) Родная мова не патрабуе шмат ад сваіх носьбітаў, яе трэба проста любіць, паважаць, берагчы як нацыянальную каштоўнасць. 18) Мы часам саромеемся гаварыць па-беларускі, называем тысячы прычын-перашкод для гэтага. 19) А між тым толькі родная мова здольная паказаць усяму свету нашу самабытнасць, адметнасць, індывідуальнасць. 20) Яна своеасаблівы культурны код, люстэрка грамадска-палітычнага развіцця нашага народа, яго мыслення і псіхікі. 21) Яна не знікне, калі будзе людское жаданне размаўляць на ёй. 22) Гаварыць па-беларуску – значыць пазнаваць, прызнаваць і паважаць сябе як нацыю. 23) Не будзем забывацца на словы Францішка Багушэвіча: «Яно добра, а нават і трэба знаць суседскую мову, але найперш трэба знаць сваю».

## *Заданні да тэксту*

**Заданне 1.** У адным са сказаў 11–13 тэксту знайдзіце слова, якое мае значэнне ‘*пашыраны*’.

**Заданне 2.** У адным са сказаў 17–18 тэксту знайдзіце сінонім да назоўніка *скарб*.

**Заданне 3.** У 11-м сказе тэксту знайдзіце антонім да слова *пад прымусам*.

**Заданне 4.** Пастаўце падкрэслены ў 19-м сказе тэксту назоўнік у форму творнага склону адзіночнага ліку.

**Заданне 5.** Пастаўце падкрэслены ў 1-м сказе тэксту прыметнік у форму роднага склону адзіночнага ліку мужчынскага роду.

**Заданне 6.** Знайдзіце ў 22-м сказе тэксту займеннік, пастаўце яго ў форму давальнага склону адзіночнага ліку.

**Заданне 7.** Пастаўце падкрэсленае ў 7-м сказе тэксту словазлучэнне ў форму меснага склону.

**Заданне 8.** Пастаўце падкрэсленае ў 5-м сказе тэксту словазлучэнне ў форму творнага склону.

**Заданне 9.** Вызначце, якой часцінай мовы з’яўляецца падкрэсленае ў 10-м сказе тэксту слова.

**Заданне 10.** У 18-м сказе тэксту знайдзіце слова з марфалагічнай памылкай. Выпраўце памылку.

**Заданне 11.** У 15-м сказе тэксту знайдзіце слова з арфаграфічнай памылкай. Выпраўце памылку.

**Заданне 12.** Вызначце стыль і тып тэксту.

## Гарадзішча

1) Агароджваць, агарод, горад – усе гэтыя словы сугучны слову «гарадзішча». 2) Яны паходзяць ад старадаўняга слова «гарадзіць» – абносіць нейкае месца тынам, плотам.

3) Паглядзіце на карту Беларусі. 4) Вы знойдзеце на ёй вельмі многа вёсачак з назваю Гарадзішча. 5) Гэта азначае, што побач з вёскамі ці на іх месцы ў старажытнасці знаходзіліся ўмацаваныя пасяленні людзей.

6) Гарадзішчы з’явіліся ў бронзавым веку, калі людзі не ўмелі яшчэ здабываць жалеза. 7) Нашы продкі выбіралі для гарадзішчаў высокія пагоркі, мысы ў сутоках рэк, схаваныя ў балотах выспы. 8) У такім месцы насыпаўся земляны вал, а часам вакол капаўся яшчэ і роў. 9) Па вяршыні вала абавяскова рабілі драўлянае ўмацаванне – вастракол ці сцяну з бярвення. 10) Адно гарадзішча належала аднаму роду – вялікай старажытнай сям’е, дзе ўсе былі сваякамі.

11) Міналі стагоддзі. 12) Адны людзі сыходзілі з абжытых гарадзішчаў, другія прыходзілі. 13) Мяняліся і станавіліся больш трывалымі прылады працы. 14) З’явіліся заможныя князі, ваяры, спецыялісты-рамеснікі і гандляры. 15) Паступова і гарадзішчы ператварыліся ў невялікія гарадкі і гарады. 16) Не ўсе, вядома, а толькі тыя, што стаялі на скрыжаванні гандлёвых шляхоў.

17) Назва Гарадок захавалася і сёння ў Віцебскім, Жлобінскім, Полацкім і іншых раёнах. 18) Некаторым з гэтых паселішчаў пашчасціла стаць вялікімі гарадамі. 19) Самыя вядомыя, якія захавалі старажытныя назвы, – Гродна і Навагрудак. 20) У летапісах яны называюцца Городня, Городень, Новагарадок, Новагародак – усё ад таго ж слова «гарадзіць». 21) На Беларусі захавалася каля тысячы гарадзішчаў – сведкаў багатай і цікавай гісторыі нашай краіны.

### *Заданні да тэксту*

**Заданне 1.** Растлумачце лексічнае значэнне падкрэсленага ў 14-м сказе назоўніка і вызначце спосаб яго ўтварэння. Успомніце назвы людзей паводле роду заняткаў, прафесіі, якія маюць такі суфікс, як у дадзеным назоўніку.

**Заданне 2.** Падбярыце сінонімы да падкрэсленага ў 10-м сказе тэксту назоўніка.

**Заданне 3.** Вызначце род падкрэсленага ў 21-м сказе тэксту назоўніка.

**Заданне 4.** Пастаўце падкрэслены ў 6-м сказе тэксту назоўнік у форму роднага склону адзіночнага ліку.

**Заданне 5.** У 7-м сказе тэксту знайдзіце прыналежны займеннік і пастаўце яго ў форму давальнага склону адзіночнага ліку мужчынскага роду.

**Заданне 6.** У сказах 3–5 тэксту знайдзіце поўны дзеепрыметнік і пастаўце яго ў форму творнага склону множнага ліку.

**Заданне 7.** Пастаўце падкрэслены ў 8-м сказе тэксту дзеяслоў у неазначальную форму.

**Заданне 8.** Вызначце, ад якога слова і якім спосабам утвораны падкрэслены ў 16-м сказе тэксту прыметнік.

**Заданне 9.** Вызначце, якой часцінай мовы з'яўляецца падкрэсленае ў 1-м сказе тэксту слова.

**Заданне 10.** У 10-м сказе тэксту знайдзіце слова з марфалагічнай памылкай. Выпраўце памылку.

**Заданне 11.** У 9-м сказе тэксту знайдзіце слова з арфаграфічнай памылкай. Выпраўце памылку.

**Заданне 12.** Вызначце стыль і тып тэксту.

## Сотнікаў

1) Некалькі хвілін яны прадзіраліся па хмызняку; збоч са снегу тырчала сухое трысцё, якое ціха і нудна шархацела на ветры. 2) Неўпрыкмет перайшлі засыпаную снегам рачулку і зноў пайшлі поплавам, грузнучы нагамі ў рыхлым глыбокім снезе.

3) Сотнікава апаноўвала санліва-знямоглая абыякавасць да ўсяго на свеце. 4) Толькі намаганнем волі ён прымушаў сабе ісці, не спыніцца і не ўпасці, а ў вушах са звонам гудзела – ад ветру ці, можа, ад стомы.

5) Урэшце яны выбраліся з кустоў, але наперадзе іх чакаў пагорак, і тут Сотнікаву стала зусім кепска: млелі ногі. 6) Добра, што снег тут памялеў, а сям-там яго і зусім не было, пад падэшвамі мулялі пыльныя цёмныя плешыны.

7) Рыбак далёка выскачыў наперад і доўга шыбаваў па касагоры, мусіць, каб выбрацца на пагорак і агледзецца. 8) Але, яшчэ не ўзабраўшыся на яго, ён спыніўся. 9) Сотнікаў падумаў, што той нешта ўбачыў – мусіць, недалёка ўжо была вёска.

10) Снегавы пагорак, над якім вісела прысмужанае зорнае неба, крута задзіраўся ўгору і знікаў у туманным змроку. 11) Ззаду ж шырока разлеглася шэрая роўнядзь поплаву – з кустоўем, нейкімі невыразнымі плямамі, няпэўнымі ў змроку расплывістымі ценямі, а яшчэ далей, амаль не праглядваючыся, цьмеў дзесьці лес, з якога яны ішлі. 12) Ён быў далёка, той лес, а наўкола стыла на марозе чыстае поле – калі што, тут падмогі ніадкуль не будзе.

13) Рыбак усё чакаў, і Сотнікаў з гарачнаю задышлівасцю дашкандыбаў да яго, ужо не пільнуючыся следу, – ступаў абы-куды, толькі б не ўпасці. 14) І тады, падыйшоўшы, згледзеў: Рыбак стаяў на дарозе.

15) Яны не сказалі адзін аднаму нічога, толькі ўслухаліся, паўзіраліся і памалу пайшлі ўгору – адзін па правай, а другі па левай каляіне. 16) Дарога, напэўна, вяла ў вёску – яшчэ можа пашчасціць дапнуцца да яе, не зваліцца ў хадзе, і тады ўжо будзе відаць, як і што рабіць далей.

17) Неўзабаве яны выйшлі на вяршыню пагорка. 18) Наўкола мроіўся начны прывідны прастор: шэрань, снег, суцемак з мноствам няўлоўных пераходаў, паўценяў і плям. 19) І нідзе не было ні агеньчыка, ні руху – змоўкла, замерла, стаілася зямля. 20) І не дай бог у такі час напаткаць тут людзей – людзі не прынясуць ім удачы, не тых людзей можна цяпер чакаць на дарозе.

### *Заданні да тэксту*

**Заданне 1.** Знайдзіце ў тэксце слова, якое адпавядае значэнню ‘*луг у пойме ракі*’. Пастаўце яго ў форму назоўнага склону множнага ліку.

**Заданне 2.** Падбярыце сінонімы да падкрэсленага ў 7-м сказе тэксту дзеяслова.

**Заданне 3.** У адным са сказаў 5–6 тэксту знайдзіце антонім да прыметніка *светлы*.

**Заданне 4.** У апошнім абзацы тэксту знайдзіце ўстойлівы выраз.

**Заданне 5.** Вызначце род падкрэсленага ў 18-м сказе тэксту назоўніка.

**Заданне 6.** Пастаўце падкрэслены ў 20-м сказе тэксту назоўнік у форму творнага склону множнага ліку.

**Заданне 7.** Пастаўце падкрэсленае ў 12-м сказе тэксту словазлучэнне ў форму меснага склону адзіночнага ліку.

**Заданне 8.** Ад асновы дзеяслова, падкрэсленага ў 15-м сказе тэксту, утварыце дзеепрыслоўе.

**Заданне 9.** Вызначце, ад якога слова і якім спосабам утвораны падкрэслены ў 17-м сказе тэксту назоўнік.

**Заданне 10.** У 4-м сказе тэксту знайдзіце слова з марфалагічнай памылкай. Выпраўце памылку.

**Заданне 11.** У 14-м сказе тэксту знайдзіце слова з арфаграфічнай памылкай. Выпраўце памылку.

**Заданне 12.** Вызначце стыль і тып тэксту.

## Спадчына

1) Спадчына. 2) Якое простае слова! 3) Які няпросты яго сэнс! 4) Цяжка ўявіць сабе чалавека без гісторыі, без кроўных сувязей з роднай зямлёй, без адчування сваіх вытокаў, без памяці, без душы, без роду і племені.

5) Кожны з нас паасобку і ўсе мы разам складаем народ, Радзіму, пачуццё любові да якой глыбокае і вялікае ў кожнага сумленага чалавека. 6) Усіх яднаюць галоўныя рысы характару – любоў да роднай зямлі, пашана да яе самых запаветных багаццяў і духоўных каштоўнасцей.

7) Прыемна і радасна бачыць, як за апошнія гады ў нашых гарадах і вёсках адкрыты новыя музеі, мемарыяльныя комплексы, якія сімвалізуюць народную ўдзячнасць героям Вялікай Айчыннай вайны, дзеячам навукі, культуры і мастацтва.

8) Памяць народа – гэта самае вялікае багацце, якое і называецца спадчынай. 9) Род і народ яднаюцца адным дарагім словам – Радзіма. 10) Гэта родныя і блізкія цябе людзі, твая сям’я, твае продкі, памяць пра іх добрыя справы.

### *Заданні да тэксту*

**Заданне 1.** Знайдзіце ў адным са сказаў 1–4 тэксту слова, якое адпавядае значэнню ‘*аднаўленне ў свядомасці вобразаў і падзей мінулага, узнаўленне з’яў, якія ў цяперашні момант не дзейнічаюць непасрэдна*’. Пастаўце яго ў форму творнага склону адзіночнага ліку.

**Заданне 2.** Падбярыце сінонімы да падкрэсленага ў 3-м сказе тэксту назоўніка.

**Заданне 3.** У адным са сказаў 8–10 тэксту знайдзіце антанімічнае словазлучэнне да фразеалагізма *сёмая вада на кісялі*.

**Заданне 4.** Вызначце, якой часцінай мовы з’яўляецца падкрэсленае ў 6-м сказе тэксту слова.

**Заданне 5.** Пастаўце падкрэсленыя ў 7-м сказе тэксту назоўнікі ў форму меснага склону адзіночнага ліку.

**Заданне 6.** Пастаўце падкрэслены ў 5-м сказе тэксту прыметнік у форму назоўнага склону множнага ліку.

**Заданне 7.** Пастаўце падкрэслены ў 4-м сказе тэксту займеннік у форму меснага склону.

**Заданне 8.** Ад асновы дзеяслова, падкрэсленага ў 8-м сказе тэксту, утварыце дзеепрыслоўе.

**Заданне 9.** Вызначце марфемы, з якіх складаецца падкрэслены ў 9-м сказе тэксту дзеяслоў.

**Заданне 10.** У 10-м сказе тэксту знайдзіце слова з марфалагічнай памылкай. Выпраўце памылку.

**Заданне 11.** У 5-м сказе тэксту знайдзіце слова з арфаграфічнай памылкай. Выпраўце памылку.

**Заданне 12.** Вызначце стыль і тып тэксту.

## ТЭКСТЫ ДЛЯ ПЕРАКЛАДУ

### Днепр

Днепр – одна из самых больших рек Европы после Волги, Дуная и Урала: ее общая протяженность составляет 2201 километр. Протекая по территории России, Беларуси и Украины, она впадает в Черное море.

Величие водных просторов реки производит удивительное впечатление. Красива она в любое время года: летом зеркальная гладь обрамлена густой зеленью, осенью она практически сливается с синим небом, зимой на большей части устанавливается толстый лед, появляются живописные сугробы, весной можно наблюдать ледоход.

Днепр воспет многими поэтами – эта река прочно вошла как в древний, так и современный фольклор славянских народов. Кроме славян, на ее берегах основывали свои поселения представители Трипольской цивилизации, скифы, сарматы, греки. Одно из древних названий реки Днепр – Борисфен, которое встречается в работах греческого историка Геродота, а также в трудах Плиния и Страбона. У римских историков река именуется как Данаприс, у древних славян – Славутич, а у крымских татар – Узу.

Современное название Днепра уходит корнями к иранским языкам, на которых разговаривали племена скифов и сарматов. Корень dān,

который в разных вариантах широко распространен среди гидронимов, обозначал слово «река», āpr – «глубокая». Таким образом, название реки в переводе означает «глубокая река».

## Радуга

Радуга – это атмосферное оптическое явление, наблюдаемое при освещении ярким источником света множества водяных капель дождя или тумана. Радуга выглядит как разноцветная дуга или окружность, составленная из цветов спектра видимого излучения. Это те семь цветов, которые принято выделять в радуге, но следует иметь в виду, что на самом деле спектр непрерывен, его цвета плавно переходят друг в друга через множество промежуточных оттенков.

Центр окружности, которую описывает радуга, лежит на прямой, проходящей через наблюдателя и Солнце, в антисолнечной точке. Поэтому для наблюдателя на земле радуга обычно и выглядит как дуга окружности. Чем ниже Солнце над горизонтом, тем ближе дуга к половине окружности, а высота верхушки радуги над землёй – к 42 градусам. Чем выше точка наблюдения, тем дуга полнее.

Когда Солнце поднимается выше 42 градусов над горизонтом, окружность возможного появления радуги оказывается ниже уровня земли, и наблюдатель, находящийся на её поверхности, видеть радугу не может. Приблизиться к радуге, как и к горизонту, нельзя.

При определенных обстоятельствах можно наблюдать двойную, перевёрнутую или даже кольцевую радугу. На самом деле эти явления уже другого процесса – преломления света в кристаллах льда, рассеянного в атмосфере, которые относятся к гало. Для появления в небе перевернутой радуги необходимы специфические погодные условия, характерные для Северного и Южного полюсов. Перевернутая радуга образуется за счет преломления света, проходящего через льдинки тонкой завесы облаков на высоте 7–8 тысяч метров. Цвета в такой радуге располагаются наоборот: фиолетовый вверху, а красный внизу.

## Восточнославянские языки

Восточнославянские языки относятся к группе, входящей в состав славянской ветви индоевропейской языковой семьи. Они распространены в восточной Европе и северной части Азии. Сейчас из

этой группы насчитывается три живых языка – белорусский, русский и украинский. Иногда в качестве четвёртого рассматривается русинский, который чаще всего принимают за диалект украинского языка.

История современных восточнославянских языков легко прослеживается по сохранившимся письменным памятникам. Языковеды считают, что современные восточнославянские языки восходят к одному источнику – древнерусскому языку, разговорный вариант которого имел территориальные диалекты, отличавшиеся своими фонетическими, лексическими и морфологическими чертами.

С XIV века начинается формирование самостоятельных родственных восточнославянских языков, ставших в итоге отдельными – русским, белорусским и украинским.

С конца X века восточные славяне в связи с распространением христианства получили письменность, пришедшую из Болгарии. Современные восточнославянские языки используют алфавиты, созданные на основе кириллицы.

